*Наталія Жывалкоўская мае вялікі вопыт і стаж працы ў сферы культуры, з 2006 года працуе ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі загадчыкам сектара аддзела культурна-відовішчнай дзейнасці.*

*З'яўляецца сцэнарыстам, рэжысёрам-пастаноўшчыкам большай часткі мерапрыемстваў і новых праектаў НББ, а таксама творчых выступленняў супрацоўнікаў бібліятэкі.*

*Прапануем вашай увазе новую рубрыку «Наш сцэнарый», у якой будуць размешчаны яе аўтарскія сцэнарыі розных тэматычных мерапрыемстваў. Раім вам карыстацца імі як наборам ідэй, тэкставых «падводак» і каментарыяў, карысных для правядзення мерапрыемстваў падобнай тэматыкі. Форма і змест сцэнарыя могуць вар'іравацца ў залежнасці ад рэальных магчымасцей установы і патрабаванняў часу.*

**Наталія Жывалкоўская**



**Загадчык сектара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі**

# СЦЭНАРЫЙ ЛІТАРАТУРНА-МУЗЫЧНАГА САЛОНА, ПРЫСВЕЧАНАГА 220-ГОДДЗЮ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ АДАМА МІЦКЕВІЧА, «БАЛЬ НАВАГРУДСКАГА ПЕСНЯРА»



*Мерапрыемства разлічана на вучняў старэйшых класаў сярэдніх навучальных устаноў, студэнтаў каледжаў, ліцэяў, універсітэтаў, дарослую аўдыторыю. Да яго падрыхтоўкі далучаюцца ўдзельнікі тэатральнага калектыву, выхаванцы студый выяўленчага мастацтва, якія ў касцюмах дадзенай эпохі ствараюць атмасферу салонаў XIX ст. – згодна са сцэнарна-рэжысёрскім ходам нязмушана гутараць, малююць у альбомах, чытаюць вершы, падтрымліваюць выканаўцаў музычных твораў.*

*За месяц да мерапрыемства аб'яўляецца конкурс літаратурных твораў (вершаў, прозы, эсэ і г. д.) «Маю край, радзіму дум маіх...», прысвечаных Адаму Міцкевічу, распрацоўваецца палажэнне конкурсу. Аргкамітэт, члены журы прысуджаюць месцы, загадзя рыхтуюць дыпломы пераможцаў, адбіраюць работы да ўдзелу ў выстаўцы.*

*Афармленне пляцоўкі: на сцелажах размешчана тэматычная кніжная экспазіцыя, увазе гледачоў прадстаўлены лепшыя творчыя працы ўдзельнікаў конкурсу, работы выяўленчага мастацтва – ілюстрацыі да яго твораў. Афармлена фотавыстаўка (па магчымасці). Для дэманстрацыі тэматычнай прэзентацыі і відэафільма выкарыстоўваецца плазменная панэль або відэа-праектар.*

*Дэкарацыі, прадметы мэблі і інтэр'ера, афармленыя ў стылі XIX ст., правільнае дадатковае асвятленне ствараюць акцэнты на асобных зонах пляцоўкі, служаць афармленнем, дадаюць агульную відовішчнасць.*

*Да пачатку мерапрыемства гучыць фартэпіянная музыка XIX ст. Госці збіраюцца ў зале. Іх вітаюць касцюміраваныя персанажы.*

*Гучыць паланэз. Удзельнікі тэатральнага калектыву ўрачыста распачынаюць сустрэчу цырыманіяльным танцам. Выканаўцы размяшчаюцца ў зале, змяняецца фанаграма.*

*Гучыць голас у запісе:*

Паэты нараджаюцца ў карчме,
Каб іх пасьля
Аплаквалі саборы.

Выгнаньніку
Ня ў сьпіну вецер дзьме, –
Ён носіць край абражаны
З сабою.

Маўчы, ўсыпальня каралёў...
Вякі
Прыціхлі
Над геральдыкай нямою.

Спытае нехта:
– Быў кароль які,
Калі пісаў паэт:
«Ojczyzno moja...»?

(Р. Барадулін)

*На пляцоўцы з'яўляецца вядучая ў касцюме XIX ст.*

ВЯДУЧАЯ:

Мы вітаем Вас, паважаныя госці, у літаратурна-музычным салоне – традыцыйным інтэлектуальным месцы сустрэч аўтараў, мастакоў, артыстаў і проста нераўнадушных творчых людзей, месцы, дзе яны знаходзілі для сябе цікавасць і душэўны спачын.

Сёння нас сабрала ў гэтай зале значная падзея ў духоўным жыцці славянскага сусвету: мы святкуем 220-годдзе з дня нараджэння Адама Міцкевіча – вялікага паэта беларускага паходжання, публіцыста, асветніка, творчасць якога блізкая і зразумелая людзям усіх краін.

Давайце паразважаем... Як нараджаецца асоба сусветнага маштабу? Што ўплывае на развіццё асабістых якасцей? Незвычайны дар – талент? Бясспрэчна. Але для яго раскрыцця неабходны адпаведныя ўмовы: традыцыі продкаў, сямейныя адносіны, добрая адукацыя і тыя людзі, хто побач... Род, чые карані ўмацоўваліся кожным пакаленнем і, безумоўна, духоўная мудрасць. А таксама прыгажэйшая зямля, якая нараджае такія шчодрыя таленты. І які гэта вялікі гонар – быць чалавекам сваёй зямлі і асобай сусветнай вядомасці і славы!..

Сённяшняя сустрэча – зварот да мудрасці, высокай духоўнасці і запаветаў славутага земляка, патрыёта сваей Радзімы, чалавека з вельмі чулай душой – ***Адама Міцкевіча!***

Каб пачаць наша мерапрыемства, я запрашаю да мікрафона .........*(афіцыйную асобу)*.

*Выступленне афіцыйнай асобы.*

*Гучыць фонавая музыка.*

ВЯДУЧАЯ:

У маскоўскі і пецярбургскі перыяды Адам Міцкевіч часта наведваў літаратурныя салоны вышэйшага свету, дзе набыў славу незвычайнага імправізатара. Аднойчы ў салоне Зінаіды Валконскай, дзе збіраліся дзеячы расійскай літаратуры і культуры, Міцкевіч прадэкламаваў толькі што складзеную ім эпіграму на французскай мове. Пушкін раптам ускочыў з месца, абняў Міцкевіча і ўсклікнуў: «Какой гений! Какой священный огонь! Что я рядом с ним?»

А вось успаміны самой княгіні Валконскай: «... Нехта назваў чужую краіну, чужую для нас, святую для яго. Там маці ацёрла ягоную першую слязу, там упершыню сэрца яго знайшло каханне, там паданні абуджалі яго геній, там думка і Радзіма зрабілі яго паэтам!.. Бард нязведаных прастораў узносіць магутную песню. Фразы яго кароткія, палкія, энергічныя, здаецца, Бацькаўшчына ўслухоўваецца ў гэтыя словы, ганарыцца сваім талентам, бо яна сама ўсюды і заўсёды той горан, які яго азарае і сагравае...»[1]

Вось так у паэзіі Адама Міцкевіча ва ўсёй велічы паўставала наша мінулае, багацце нашых традыцый і абрадаў, чароўная прырода родных мясцін... Расказваючы пра сваю Літву-Беларусь, вялікі паэт адрасаваў свае творы людзям і чакаў ад іх спагады і разумення...

Больш чым на 30 моў свету перакладзены яго творы. Сярод вядомых імён перакладчыкаў на беларускую мову – імя нашага сучасніка, пісьменніка, этнографа Кастуся Цвіркі. Мы запрашаем паслухаць пераклад твора Адама Міцкевіча «..................» у выкананні ......................

*Дэкламуюцца вершаваныя творы А. Міцкевіча*

ВЯДУЧАЯ:

Вашы апладысменты!

[1] *http://bk.knihi.com/filamaty/filamaty1.html*

Згадзіцеся, час дазваляе па-новаму зірнуць на мінулае, ацаніць яго, параўнаць з сучаснымі падзеямі, адкрыць штосьці, раней не заўважанае. Упэўнена, вы пераканаецеся ў гэтым пасля прагляду ўрыўка з дакументальнай відэастужкі «………………..». Калі ласка, увага на экран.

*Дэманструецца ўрывак з фільма на 5–6 хвілін.*

*Прапанаваныя для паказу фільмы (можна знайсці ў сетцы Інтэрнэт):*

*1. Фільм «Адам Мицкевич. Неугодный поэт» з цыкла «Обратный отсчет» (тэлеканал АНТ). Рэжысёр Людміла Клінцова, аўтар сцэнарыя Таццяна Сухоцкая.*

*2. Дакументальны фільм Алеся Гізуна і Аляксандра Трыпуцька «Сакральный топос Адама Мицкевича».*

*3. «Адам Мицкевич – странник свободы» / Adam Mickiewicz. Гении и злодеи. Праект Льва Нікалаева. (2013).*

*4. Цыкл дакументальных фільмаў аўтарскага тэлепраекта Алега Лукашэвіча «Эпоха», прысвечаны класіку сусветнай паэзіі Адаму Міцкевічу (2008).*

*Гучыць фонавая музыка.*

ВЯДУЧАЯ:
Мы зноў вяртаемся ў XIX стагоддзе – яркі перыяд у гісторыі славеснасці, выяўленчага мастацтва, а таксама музыкі. Салон – вельмі тонкая форма грамадскага жыцця таго часу – злучаў сур'ёзныя, глыбокія інтарэсы наведвальнікаў з творчай імправізацыяй, а іх публічную дзейнасць – з утульнай хатняй абстаноўкай.

У нашым салоне вас чакае сустрэча з чароўнымі таленавітымі дзяўчатамі і, з іх стаўленнем на каштоўнае мінулае. Як сімвал любові і ўдзячнасці вялікаму паэту Адаму Міцкевічу, для вас прагучыць *(назваць твор)*.

*Студэнты творчай навучальнай установы выконваюць урывак з оперы, раманс або інструментальны музычны твор.*

ВЯДУЧАЯ:
Вашы апладысменты маладым таленавітым выканаўцам!

Безумоўна, гэта прыемна, калі чалавек імкнецца да рэалізацыі сваіх духоўных патрэб і творчых здольнасцей. І калі гэта здзяйсняецца, свет расквечваецца новымі яркімі фарбамі, так, як гэта атрымліваецца сёння на нашай сустрэчы.

Яна сабрала шмат цікавых творчых асоб – прафесіяналаў сваёй справы, для якіх постаць Адама Міцкевіча і яго літаратурная спадчына маюць немалаважнае значэнне.

Аднаго з іх я з задавальненнем запрашаю да мікрафона. Калі ласка, ……………

*Выступленне паважанага госця. Да выступлення можа быць запрошаны настаўнік літаратуры, філолаг, супрацоўнік музея, літаратуразнаўца, даследчык творчасці паэта.*

ВЯДУЧАЯ: Дзякуем, *(імя выступоўцы)*
Мы працягваем размову пра паэта і яго творчасць. Адам Міцкевіч быў, безумоўна, выдатнай, незвычайнай асобай, але перш за ўсё зямным чалавекам. Ужо раннія яго вершы здзіўляюць багаццем унутранага свету і праўдзівасцю чалавечых пачуццяў. Любоўная лірыка, прысвечаная Марылі Верашчака, пранікнёныя песні і апісанні прыроды, дасціпныя жарты і імправізацыі. Ступень за ступенню Міцкевіч паднімаўся ўсё вышэй у сваёй творчасці.

У 1834 г., жывучы ў Парыжы, ён завяршыў працу над самым значным сваім творам – паэмай-эпапеяй «Пан Тадэвуш», якая стала сапраўдным гімнам хараству роднай зямлі, неўміручай песняй светламу няздзейсненаму каханню.

А якія незвычайныя і яркія яго «Крымскія санеты»! Польскі літаратуразнаўца і гісторык граф Тарноўскі з гэтай нагоды пісаў: «...Для мэтаў Міцкевіча санет даваў форму, якая найбольш падыходзіць. Лірычны і кароткі верш дазваляў паэту прадставіць сам прадмет толькі беглымі рысамі, адной лініяй, толькі даць адчуць уражанне ад яго...». Менавіта ў гэтым сутнасць асаблівасцей санетаў Міцкевіча.

Паважаныя сябры, вам прапануецца адчуць уражанне ад санета ў выкананні ………………..

*Выкананне санета*

ВЯДУЧАЯ:
Згадзіцеся, усе мы прыходзім у гэты свет са сваім прызначэннем. Самае галоўнае – зразумець, для чаго ты жывеш, і прайсці па жыццёвым шляху, пакінуўшы на ім частку сваёй душы. А што можа пакінуць чалавек натхнёны і таленавіты? Першым-наперш – творчасць, якая робіць наш свет лепшым, больш чыстым і мудрэйшым.

Я спадзяюся, з гэтым згодны ўсе прысутныя, а асабліва – аматары творчасці Адама Міцкевіча, удзельнікі літаратурнага конкурсу «Маю край, радзіму дум маіх…». Сёння мы з задавальненнем падводзім яго вынікі і запрашаем да мікрафона старшыню журы конкурса ………..

## Наш сцэнарый

*Уручэнне ўзнагарод пераможцам. Знаёмства з лепшым літаратурным творам.*

*Гучыць фонавая музыка.*

ВЯДУЧАЯ:

Наш свет заўсёды змяняецца... Сыходзяць эпохі, вялікія цывілізацыі адыходзяць у нябыт. Але ў чалавецтва ёсць абарона ад духоўнага вымірання – гэта вечныя ісціны, якія завешчаны нам Богам і продкамі. Яны вучаць нас дабру, чалавекалюбству і міласэрнасці. Паважаныя сябры, помніце аб іх, адчувайце свае карані – і гэта, безумоўна, умацуе нашу будучыню.

І няхай кожнаму з вас добрай парадай стануць словы вялікага Адама Міцкевіча:

*Хай радасць з вачэй нашых блісне*
*І ўвенчыцца лаўрамі голаў!*
*Далонь даланю моцна сцісне!*
*Зноў разам мы! Наша тут кола!*

*Прысягу сяброўскую помні,*
*Няхай кожны дзень і імгненне*
*Табе свецяць словы, як промні:*
*Айчына, навукі, сумленне!*

Наша сустрэча ў музычна-літаратурным салоне падыходзіць да свайго завяршэння. Я развітваюся з вамі і запрашаю нашых дам і кавалераў на гэту імправізаваную танцавальную пляцоўку.

А пасля танца пазнаёмцеся, калі ласка, з тэматычнай экспазіцыяй у межах сённяшняй сустрэчы. Усяго найлепшага!

*Удзельнікамі мерапрыемства выконваецца фінальны танец (вальс, мазурка) або праводзіцца майстар клас па танцах XIX ст.*

*P. S. Мерапрыемства можа ўключаць таксама блок «Хвала возлюбленной, открывшей мне творца!», прысвечаны каханню і жанчынам у жыцці А. Міцкевіча.*

*Цікавыя звесткі аб жыцці і творчасці паэта змяшчае кніга «Мицкевич» Мечыслава Яструна з серыі «ЖЗЛ».*


### Summary

Presented a plan of holding for the literary and musical salon.